*Акцэнты тыдня:*

## краіна

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета з 85-годдзем з дня заснавання ўстановы. «Гісторыю тэатра пісалі выдатныя майстры, адданыя сваёй справе. Славу яму здабылі цудоўныя салісты, артысты, дырыжоры, рэжысёры і мастакі», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сёння ўстанова з'яўляецца гонарам і здабыткам нацыянальнай тэатральнай культуры, захоўваючы і развіваючы лепшыя традыцыі акадэмічнага мастацтва, адкрываючы гледачу новыя імёны.

Кіраўнік дзяржавы прывітаў выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі краіны. «Празвінеў апошні школьны званок. Адзінаццаць гадоў таму ён паклікаў на першы ўрок малышоў, а сёння выпраўляе ў дарослае жыццё юнакоў і дзяўчат. Цяпер думкі, планы і мары кожнага з вас накіраваны ў будучыню. Якой яна будзе, шмат у чым залежыць ад выбару прафесійнага шляху і рэалізацыі свайго прызначэння. Куды б ні прывёў гэты пошук, памятайце: вы патрэбны сваёй Радзіме», — гаворыцца ў прывітанні. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі шмат зроблена для таго, каб маладыя людзі маглі раскрыць на роднай зямлі свае таленты, дамагчыся поспеху, адчуваць сябе па-сапраўднаму шчаслівымі і ўпэўненымі ў заўтрашнім дні.

Выстаўка творчых дасягненняў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў Беларусі, якую курыруе дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Павел Сапоцька, можа стаць традыцыйнай. Экспазіцыя ладзіцца ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Усяго для ўдзелу ў выстаўцы паступіла каля тысячы заявак, для экспанавання выбрана 300 работ. Да 5 чэрвеня наведвальнікі мастацкай галерэі змогуць убачыць першую палову твораў, потым будзе прадстаўлена другая частка экспазіцыі.

Адным з мерапрыемстваў Дзён культуры Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Беларусі стане выстаўка «Нацыянальныя касцюм і народныя промыслы В'етнама», якая адкрыецца 13 чэрвеня ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі. У экспазіцыі будзе прадстаўлена калекцыя традыцыйных лакафарбавых вырабаў, вырабы з бамбуку і ратангу, знакамітая кераміка з вёскі Батчанга, вядомая з XV стагоддзя. Асобны раздзел складуць 20 касцюмаў этнічных груп В'етнама. Розныя рэгіёны краіны прадстаўлены калекцыяй лялек у этнічных касцюмах і шматлікімі вырабамі з шоўку і парчы. Выстаўка дазваляе лепш зразумець і палюбіць традыцыйную культуру далёкай усходняй краіны.

V Форум бібліятэкараў Беларусі «Гуманітарна-асветніцкая дзейнасць бібліятэк у кантэксце агульначалавечых каштоўнасцей і беларускай дзяржаўнасці» праходзіць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Больш як 400 аўтарытэтных спецыялістаў бібліятэчнай сферы сабраліся, каб абмеркаваць пытанні нарматыўна-прававога забеспячэння галіны і арганізацыі карпаратыўнага ўзаемадзеяння бібліятэк у сферы забеспячэння доступу насельніцтва да інфармацыйна-бібліятэчных рэсурсаў і ацаніць стан бібліятэк Беларусі. Адно з мерапрыемстваў форуму ладзіцца ў межах сусветнага праекта Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый, пад эгідай якой з 2017 года па ўсім свеце абмяркоўваюцца шляхі развіцця кніжніц.

**Агляд афіцыйных падзей ад Міры ІЎКОВІЧ**